НАША БУДУЧЫНА

Цана асобнага нумару 200 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільна, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкаў да хаты 800 м. п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 3. **Субота, 20-га студня 1923 г.** **Год II.**

Палітычныя хмары.

Трывожныя дні паражывае ўся Эўропа ў тым ліку і мы.

Ужо заняцьце французамі часьці Нямецкае зямлі над Рэйнам, дзе знаходзяцца найбагацейшыя капальні каменнага вугальля і найвялікшыя нямецкія фабрыкі, выклікала агульную трывогу. Выступленьне Францыі зроблена затым, што францускі ўрад не хацеў зрабіць ніякіх палягчэньняў Нямеччыне пры выплаце вялізарнае кантрыбуцыі. Другія дзяржавы, як, прыкладам Англія, лічылі такое палягчэньне зусім справядлівым і заявілі, што ня будуць памагаць Францыі у „выжыманьні“ кантрыбуцыі прынукай, бо фінансавае палажэньне немцаў дужа цяжкае.

Тады Францыя пайшла сваей дарогай адна і француская войска разам з цэлым штатам францускіх інжынераў і чыноўнікаў заняло капальняны акруг у Нямеччыне. Ня гледзячы на дэманстрацыі пратэсту, робленыя нямецкімі работнікамі і ўсім нямецкім народам, разгасьціліся на нямецкай зямлі, як у сябе дома, і пачалі самі дабываць каменнае вугальле сваімі сіламі. І вось вочы ўсяго сьвету цяпер зьвернены на Нямеччыну, усе пільна сочаць за кожным крокам яе, стаўляючы пытаньне: як нямецкі народ перанясе такую зьнявагу?

Ды йшчэ не закончыўся француск пахад, калі новае здарэньне на другім канцы Нямеччыны—значыць, зусім блізка да нас—устрывожыла ўвесь усход Эўропы. Тут, на самай мяжы паміж Нямеччынай і Літвой, пры ўсьці Нёмана ў мора, ёсьць мейсца Клайпэда, некалі належаўшая да Літвы, а пасьля да Нямеччыны і званае немцамі Мэмэль. Калі немцы былі пабіты ў сусьветнай вайне, ўзьнялася пытаньне: да каго павінна належаць Клайпэда? Апрача немцаў, па яе працягівалі рукі і літвіны,—ведама, як па калішнюю ўласнасьць, і палякі, як на вельмі важны тарговы порт на Балтыцкім моры. Ліга Народаў разсудзіла, што Клайпэда не павінна пакуль-што ні да каго не належаць, што яна будзе вольным местам пад апекай француская войска, а пасьля ей будзе дадзена права плебісцытам (усенародным галасаваньнем) выявіць сваю волю, да каго далічыцца. Дый гэта йшчэ аканчальна ня было пастаноўлена. Вось-жа колькі дзён таму назад разышлася вестка, што літоўскія дружыны дабравольцаў, не аглядаючыся на тое, што там пастановіць аб Клайпэдзе Ліга Народаў, напалі на гэтае места, загналі француская войска ў казармы і ўзялі ў свае рукі ўладу, абвяшчаючы, што места і ўвесь Клайпэдзкі акруг далучаюцца да Літвы.

Як адкажа на гэта Ліга Народаў і Францыя? — Вось пытаньне, на якое з дня на дзень чакае адказу ўся Эўропа. Паводле газэтных вестак, французы хацелі-бы прымусіць сваю саюзьніцу Польшчу крывёй сваіх салдатаў вярнуць Клайпэду Францыі. І гэта, паграждаючы новым вялікім ваенным пажарам на Усходзе, будзіць агульную трывогу. Але йшчэ вялікае пытаньне, ці палякі захочуць праліваць сваю кроў за гэту справу. Грашовая біржа, асабліва чулая на ўсялякія ваенныя трывогі, зразу выявіла вялікую паніку: амэрыканскі доляр за два-тры дні падскочыў з 23 да 38 тысяч марак. Але ўжо на чацьверты дзень цана доляра паменшала да 28 тысяч польскіх марак і мабыць будзе меншаць далей, што паказуе на некаторае ўспакаеньне.

Як-бы там ні было, мы пераживаем трывожны час. Чым ўсё скончыцца, нельга наперад сказаць, але пагроза новай вайной суліць і нашаму краю поўную эканамічную руіну, ня кажучы ўжо аб магчымых ахвярах людзьмі. Ад палітычнага розуму польскага ураду будзе цяпер залежаць, ці жыцьцё і доля многіх тысяч жыхароў Польшчы мае быць пакладзена на алтар „чужога бога“, ці наадварот, ваенная пагроза нас гэтым разам яшчэ абміне.

◆◆◆◆

Змаганьне за белар… ую школу.

◆ Школьны інспэктар Дзісьненскага павету на захады вучыцеля Чэрэпа аб адчыненьні прыватнай беларускай школы ў вёсцы Мальковічы, Мікалаеўскай гм. адказаў, што калі ён адчыніць беларускую школу, дык будзе строга пакораны, бо ён інспэктар ніколі не дазволіць адчыніць няпольскую школу.

◆ Той жа самы інспэктар не дазволіў сялянам вёскі Дарожкі, Язьненскай гм. адчыніць беларускую школу, хоць яны прадставілі прыгавор аб школе 90 падпісямі.

◆ Сяляне вёскі Ардзея, Беніцкай гміны (Ашмяншчына) пасьля доўгіх дамаганьняў адчынілі беларускую школу. Але сёлета школьны інспэктар вучыцеля гэтай школы назначыў у польскую школу, а на яго месца прыехаў паляк. Сяляне спаткалі яго ветліва, як кажаць, чым хата багата, але рашуча зазначылі, што вучыцеля яны хочаць мець толькі беларуса і няпрошаны госьць, падзякаваўшы за гасьціны, на другі дзень выехаў

◆ На ўсю Юрацішскую гміну ёсьць толькі дзьве польскія школы і гэтыя … зачыняцца, бо дзеці перасталі … з прычыны таго, што не разуме… вучыцялёў палякаў.

◆ …ка Альхоўка Дакудайскай воласьці Лідскага павету мае да 100 дзяцей школьнага узросту. Дэлегаты ад вёскі разоў дзесяць былі у інспэктара школьнага Лідскага павету, п. Вайтовіча, ў справе адчыненьня ў іх вёсцы беларускае школы, але—гэты пан адчыніў там польскую школу, у якую дзеці ня ходзяць. Чакаем здзейсьненя надзеі, што гэты інспэктар хутка будзе зьмешчаны з сваёй пасады.

◆ У м. Лебедзева, Вялейскага павету ёсьць польская школа, якая занята была школьны для усяе воласьці будынак двухклясовае школы. Працуюць там аж 4 польскія вучыцелі, прычым ні на аднаго з іх не выпадае нормаванага школьнага камплекту ў 40 вучняў.

У беларускай-жа там школе ёсьць 70 вучняў, а працаваць прымушан толькі 1 вучыцель, бо другога ніяк не вызначае польскі школьны інспэктар Вялейскага павету.

Што такое „Wyzwolenie“ з беларускага пункту гледжаньня.

1. Самы сур'ёзны-адзіны-супраціўнік.

Самым сур'ёзным супраціўнікам і канкурэнтам нашым у час выбараў было „Wyzwolenie“.

Запраўды — з 4-х дзесяткаў, круглым лікам мандатаў, якія можна лічыць прыходзіліся на беларускае населеньне Нашага Краю Wyzwolenie атрымала каля паловы—крыху больш, чым само Беларускае Аб'еднаньне,—Цэнт. Бел. Выб. Камітэт.

Большая палова дэпутатаў-беларусы, двое з іх старыя беларускія працаўнікі, вучасьнікі Усебеларускага Кангрэсу ў Менску; целы рад шаранговых працаўнікоў-беларусаў...

Недарма ў Сойме называюць нашы абшары другой бацькаўшчынай Wyzwolenia.

„Польская партыя людовая Wyzwolenie“ прыйшла да нас, акунулася ў беларускае народнае мора і... стала „беларускай“.

Усе гэта паказвае нам тое, што такі надзвычайны пасьпех партыі, абавязен якімсь глыбака лежачым прычынам і бязумоўна ня можа йсьці ў параўнаньне з тым фокусам і фоксам, з той безцэрамоннай экспэдыцыяй за мандатамі, якімі зьяўляюцца заваяваньне беларускай сялянскай Піншчыны польскай партыяй мясцовага пралетарыяту (P. P. S.)...

Таму,—тагды як іншыя супраціўнікі нашы, якія вядуць сваю партыйную работу сярод беларускіх земляробаў, могуць быць проста ігнараваны намі, такі небясьпечны супраціўнік, як Wyzwolenie, мусіць быць намі грунтоўна дасьледжаны.

II. Сацыяльная паддзелка.

„Польская Людовая партыя Wyzwolenie“ у адзнаку ад „Польскай Людовай Партыі Пяст“ асабліва ўгрунтавалася ў нашым Краі, і на гэта, ведома, ёсьць свае сацыяльныя прычыны.

Праграма Wyzwolenia, а асабліва,— аграрная праграма, — больш радыкальная, бо работа разьлічана на меньш заможны слой польскага сялянства, на больш галодных зямлёй хлебаробаў, значна розьнячыхся ад тых гаспадарча моцных заходня — польскіх „вітасаўскіх мужычкоў“, сацыяльна-палітычную ідэялёгію, якіх выяўляе Пяст.

Як раз гэты самы бедны культурай, галодны на зямлю, гаспадарча няцьверды хлебароб зьяўляецца асноўным тыпам для беларускіх абшараў, на каторыя, з часу заваяваньня іх Польшчай, пашырыла сваю дзейнасьць Wyzwolenie.

Сацыяльны стан нашага хлебароба учытваецца Wyzwolenie'м лепш і бліжэй другіх польскіх партый, і ў гэтым—значная доля пасьпеха партыі.

Праграма Wyzwolenia бліжэй усіх другіх падыходзіць да праграмы нашага Цэнт. Выбар. Камітэту, калі выключыць кардынальны пункт аб перадачы зямлі бяз выкупу, на што Wyzwolenie пры ўсім сваім радыкалізме не адважылася пайсьці.

Тут жа за важым, што найбольш небясьпечны па блізкасьці сваіх лёзунгаў наш супраціўнік на выбарах —вызваленец — стане на моцы гэтай блізкасьці, найблізшым нашым суседам і хаўрусьнікам ў Парлямэнце...

Але, ведама, варункам такое блізкасьці абодвых клюбаў мусіць стаць шчырасьць тых лёзунгаў, вернасьць той праграме, з якімі партыя Wyzwolenie ішла на выбары.

І вось тут і узьнімаецца цэлы рад трывожных пытаньняў.

Трэба адразу сказаць, што ўвесь праграмны, і ўчасцы аграрны радыкалізм Wyzwolenia наскрозь працяты хвальшывай нотай...

У нашу задачу ня уходзіць ацэнка па сутнасьці праграмы і ў часцы зямельнага пытаньня, ніякая небудзь палеміка з партыяй: нам трэба аб'ектыўна дасьледзіць зьявішча, вытлумачыць прычыны пасьпеха партыі між нашых сялян.

Таму, адразу трэба паказаць на тую б. м. з першага пагляду незаметную фальш, якая робіцца Wyzwolenie'м надта спрытна і якой была злоўлена большая палова даверчавых галасоў нашага сялянства...

Гэта хвальшывая нота перш за ўсё тлумачыцца асабістым саставам вярхоў партый, дзе, паміж беларускіх лідэраў, маюцца такія абшарнікі, як пан Хамінскі, які валодае па паведамленьням „Dzien. Wil.“—язык мяйсцовай Хіены — маёнткам у 20,000 дзесяцін, ня лічача гарадзкіх нярухомасьцяй ці — майёр Косьцялкоўскі, быўш. шэф Віленскай дэфэнзывы, таксама здабыўшага, як паведамляе тая-ж газэта, вялікі маёнтак Бернадайцы за 30,000,000 мар.

Вось двое з раду тых „мураваных людзей“, якія як лідары Wyzwolenia будуць „няхістаючыся ў бок“ бараніць мужыцкую справу. Вось якіх людзей партыя, называючая сябе „грамадой арганізаваных мужыкоў“ сялянскімі галасамі правяла ў Палаты... (гл. прадмову да праграмы Wyzwolenie).

Тыповым і асабліва важным для падазронасьці і няверы у шчырасьць выбарнага клічу партыі, з'яўляецца гэты „вайскова-дэфэнзыўны“ элемэнт, адыгрываўшы такую ролю ў кандыдацкіх сьпісках партыі і прайшоўшы цяпер, як прадстаўніцтва беларускіх сялян у Палаты.

Названая мейсцовая газэта называла цэлы рад такіх кандыдатаў Wyzwolenia б. ахвіцэраў, памятных кожнаму беларусу, так званага II аддзелу. Найбалей вядомы з іх зьяўляецца пасол Ваевудзкі, ў тойжа час мяўсцовы (хаця дробны) абшарнік.

Нежадаючы саўсім асабіста зьняважыць і пакрыўдзіць такога тыпу дэпутатаў Wyzwolenia, якія валадаюць, б. м. асабіста самымі высокімі якасьцямі разуму і сэрцу, можна сказаць з поўным пераконаньнем, што іх дзеяльнасьць у Парлямэнце ня можа ня быць прасякнута хвальшай: зьяднаць лёзунгі сацыяльнага радыкалізму з інтарэсамі вялікага земляўласьніка можна толькі ў передвыбарнай агітацыі, але саўсім немагчыма ў парля…кай працы.

Суліма.

(Далей будзе).

Аб самаупрауленьні.

Каб нас ня крыўдзілі, каб нашыя жаданьні ў адносінах да беларускае асьветы спаўняліся, патрэбна правесьці на мяйсцох арганізацыю такім спосабам, каб у мяйсцовым самаўпрауленьні былі свае людзі. Патрэбна салідная агітацыя, каб у гмінныя рады ды ў павятовыя соймікі прайшлі свае людзі, зусім сьвядомыя беларусы. Гэта бязумоўна патрэбна, бо ня можна ні на мінуту забывацца, што па істнуючых цяпер законах аб мяйсцовых самаўпраленьні, гмінныя рады і павятовыя соймікі маюць правы ў пэўных межах пастанаўляць аб усіх мяйсцовых справах у граніцах сваіх район аў. Праўда і гмінныя рады і павятовыя соймікі ў нас, на беларускіх абшарах, значна абмежаваны ў сваіх правах у параўнаньні з такімі-ж самапраўленьнямі ў самой Польшчы.

Скажам над гміннай радай у нас стаіць павятовы староста, калі-б рада што-небудзь пастанавіла ня зусім згоднае з поглядамі і пэўнымі правамі старасты, дык гэткія пастановы ня былі-б праз старасту зацьверджаны.

Гэтае цяперашняе наша куртатае самаўпраўленьне прыпамінае нам тыя куртатыя расейскія самаўпраленьні на нашых землях, якія былі заведзены тут, у нас. Будзем спадзявацца, што цяперашняе шкоднае для нас самаупраўленьне будзе новым Соймам зьменена, але, каб меньш крыўдаў было нам цяпер, трэба ўмець скарыстаць і на гэтых нявыгодных для нас законах належачыя нам правы.

Возьмем пытаньне аб нашай школе, гэтае самае балючае пытаньне сучаснага жыцьця беларускае вёскі. Як ні б'ецца вёска, як ні клапоціцца аб адчыненьні сваёй роднай школы,—кожны раз выплываюць наверх усё новыя перашкоды ў змаганьні з якімі трацінца безканечна час і грошы, і ніяк чалавек вясковы ня можа дабіцца сваёй мэты. У чужую для яго школу польскую ён не пасылае свайго дзіцяці, школы на сваёй роднай мове адчыніць нельга і ў рэзультаце пануе з ласкі польскае школьнае ўлады цемра, дзічэюць дзеці, пашыраецца ненавісьць да ўрадавых інстытуцыяў, ад волі якіх залежыць спаўненьне ці не вымаганьняў сялянства.

Што-ж нам рабіць па вёсках, каб на аснове істнуючых законаў скарыстаць хоць тыя невялікія правы, якія нам належаць, бо трэба ведаць адно, што пакуль раскалышацца новы Сойм і зьменіць нявыгодныя для нас законы і падчас самаволю некаторых польскіхураднікаў, можа прайсьці яшчэ нямала часу.

Вось тут і варочаемся мы да мяйсцовага самаўпраўленьня—гмінных радаў і павятовых соймікаў.

Усе школы як беларускія так і польскія ў межах гміны могуць быць адчынены толькі па пастанове гміннай рады. Гэта трэба добра ведаць, а дзеля гэтага пры выбарах гмінных радаў трэба старацца, каб у склад іх прайшлі свае людзі. І гэта тым больш патрэбна, што з самых радных выбіраюцца прадстаўнікі ў павятовы соймік, улада якога абыймае ўвесь павет. Калі толькі ў гэтых выбарных установах ды будуць свае людзі, дык значна лягчэй будзе адсоўваць ад сябе тыя крыўды, з якімі цяпер так цяжка нам змагацца (школы, падводная павіннасьць і інш.),

Праўда, бываюць і такія выпадкі, што калі гмінная рада складаецца з сваіх людзей і прыме, скажам пастанову аб адчыненьні некалькіх школ беларускіх у межах воласьці, дык інспэктар тады езьдзіць па вёсках альбо „спраўджае“ на новым паседжаньні гміннай рады, або на сходзе ў воласьці гэтую волю сялян. Гэтае „спраўджэньне“ фактычна зводзіцца да намоваў, каб людзі выракліся свайго, каб лепш згадзіліся на польскую школу. Але гэтым інспэктарам-агітатарам рэдка ўдаецца дасягнуць сваей мэты: сяляне і гмінная рада стаяць моцна на сваім і—інспэктару Вялейскага павету хоцькі-няхоцькі прышлося адчыніць у Лебедзеўскай воласьці сем беларускіх пачаткавых школ.

Іншыя інспэктары, як валожынскі, п. Страчынскі Мячыслаў, вымагаюць, каб пастановы гміннай рады аб беларускіх школах прыймаліся ў прысутнасьці абавязкова самаго пана інспэктара. Зусім вядома, што пану інспэктару ідзець аб тым, каб паагітаваць радных проці беларускіх школаў. Але раз склад радных салідных і моцны ў сваіх пераконаньях, дык ніякая агітацыя нічога ня зробіць і пададзеная на пісьме заява да інспэктара праз гмінную раду аб адчыненьні беларускае школы за подпісамі сялян, сьцьверджанымі подпісам солтыса і засьведчанымі войтам дойдзець свайго.

Вось дзеля гэтага і трэба, каб пры выбарах гміннае рады нашыя людзі моцна трымаліся і праводзілі туды сваіх шчырых абаронцаў. Час нам узяцца за упарадкаваньне сваіх спраў.

Баўтручонак.

✦ ✦ ✦ ✦

Палітычныя падзеі.

У Рурскім басэйне.

Нямецкія рабочыя і фабрыканты адмовіліся ад усякіх перагавораў з акупацыйнымі уладамі, за што ім пагражаюць ваенным судом.

Акупацыйныя улады безупынна вывозяць каменны вугаль у Францыю і Бэльгію і вырубаюць лясы.

У Нямеччыне чакаецца агульная забастоўка рабочых мэталюргічнай прамысловасьці.

Новыя літоўскія грошы.

Урад літоўскі выпускае новыя грошы па 50, 100 і 1000 літаў. На грашах будзе з аднэй стараны відавок Вільні, а на другой партрэт Гэдыміна.

У Польшчы.

Ацрацована праграма Соймавых прац у бліжэйшыя сэсіі. Перш на перш будуць разгледацца скарбовыя справы, будова самаупраўленьня, пасьля займуцца законамі, якія маюць на мэце выкананьня конституцыі. Сойм будзе працаваці двутыднёвымі перыядамі.

Суд над камуністамі ў Львове.

Вынесены прысуд над камунстамі ў Львове. Крулікоўскі і яшчэ чатырох камуністаў засуджаны на 3 гады цяжкага вастрога.

✦ ✦ ✦ ✦

З Беларускага жыцьця.

✦ Цантральная Беларуская Школьная Рада даводзіць да ведама сяброў Т-ва Беларускае Школы, што 28 студня 1923 г. (у нядзелю) ў Вільні, Біскупская 12 (памешк. Белар. Клюбу) а 12 гадз. дня назначаны агульны вялікі сход сяброў Т-ва Белар. Школы дзеля разгляду справаздачы старога Ураду і выбараў новага. Сход будзе лічыцца правамочным, не зважаючы на лік прыбыўшых сяброў.

Беларусы ў Латвіі.

Работа чорнай сілы.

Адносіны расейцаў да беларускага пытаньня ў Латвіі яскрава характэрызуюцца працай расейскага дэпутата з Рэжыцы у Латвійскі Сойм, п. П. Карэцкага, які ў аб'ездах сваіх па правінцыі ў мэтах агітацыі цынічна пахваляецца:

«Моя задача—уничтоженіе бѣлорусскаго вопроса в Латвіі» і намагаецца засноўваць сярод беларускага насяленьня расейскія школы.

Зьмены ў складзе праўленьня „Бацькаўшчына“.

Са складу перавыбранага агульным сходам Цэнт. Праўленьня культ.-прасьв. Т-ва „Бацькаўшчына“ ў Латвіі выйшаў Канстантын Езавітаў. Прычынаю гэтаму было тое, што Езавітаў на нарадзе ў Люцыне з расейскімі прадстаўнікамі пагадзіўся на стварэньне ў Люцыне замест беларускай гімназіі, расейска-беларускай гімназіі з мовай выкладаньня ва ўсіх клясах расейскай. Новае праўленьне, ў лік якога уходзіць Паўлінка Мядзёлка-Грыб, а старшыней Ів. Краскоўскі, не падтрымала гэтае згоды і настайвала на адчыненьні беларускай гімназіі з выкладаньнем па беларуску, што прымусіла Езавітава да выхада з праўленьня.

N. N.

Нарада вучыцялёў Беларускіх школ ў Латвіі.

Беларускі аддзел пры міністэрстве прасьветы перад самымі Калядамі тэрмінова разаслаў вучыцялем павесткі на вучыцельскі з'езд, вызначыўшы дзень з'езду 28 — 30 сьнежаня 1922 г. у м. Дзьвінску. Дзякуючы пасьпеху аддзелу значная лічба вучыцялёў беларускіх школ паведамленьня аб з'ездзе не атрымалі. Як відаць з дакладаў вучыцялёў інспэктура Беларускіх школ мала клапацілася аб паўнаце з'езду.

Адсутнасьць належнай лічбы вучыцялёў прымусіла кіраўнікоў лічыць з'езд не канфэрэнцыяй, а 1-ай вучыцельскай нарадай у Латвіі. Дзякуючы гэтаму праграма з'езду, якая была выпрацавана раней не разгледалася поўнасьцю. З праграмы больш меньш праведзен быў адзін пункт „Даклады вучыцялёў аб становішчы беларускіх школ у Латвіі“. Даклады былі вельмі цікавыя. Яны ахарактарызавалі становішча Беларускіх школ з духовага боку і з боку адносін інспэктуры да падўласных школ.

Выявілася, што палажэньне беларускасьці ў школах, прымушае жадаць шмат лепшага. Вуцьцель Махноўскі зазначыў, што ў яго школе выкладаньне вядзецца ў маскоўскай мове. Школа да гэтага часу атрымлівае загады ад Маскоўскага і Беларускага аддзелаў. Усе гэта ставіць школу у цяжкае становішча—кіраўнік школы ня ведае каму ён падпарадкаваны і чые загады павінен выконываць. Вучыцелька Пашкевіч, падчыркнула, што ў яе школе выкладаньне вядзецца на польскай мове. Вучыцялі некаторых беларускіх школ вядуць шкодную для беларускай справы агітацыю. Маюцца выпадкі пераходу бел. школак у аддзелы Маскоўскі і Польскі. Даклады зрабілі вельмі прыкрае і цяжкае уражаньне на запраўдных беларускіх працаўнікоў. Стала ясна, што інспэктар беларускіх школ у Латвіі ня здолен да творчае, грунтоўнае працы і таму падўладныя яму школкі найчасьцей маюць толькі „беларускі“ шыльд, а за ім робіцца ці расейская ці польская работа, варожым беларускасьці вучыцелям. Падобныя „беларускія школкі“ не патрэбны ні беларускай люднасьці ні для белар. інтэлігэнцыі, ні латвійскаму ураду, які утрымвае іх на дзяржаўныя кошты. Агульным жаданьнем латвійскіх беларусаў ёсьць, каб беларуская школьная справа была высвабаджана ад прымазаўшыхся да яе элемэнтаў. А пану Інспэктару ці ня варта было-б падумаць і перадаць сваю пасаду больш здольнай і сьвядомай у школьных справах асобе?

Вучасьнік вучыцельскай Нарады.

Беларуская вечарына.

Краслаўка 7 студня. Адбылася беларуская вечарына, ладжаная Краслаўскім Адзелам Т-ва Бацькаўшчына на карысьць месцовой беларускай пачаткавай школы. Пастаўлены была пьесы: „Па рэвізыі“ Крапіўніцкага і „Пасланец“ Л. Родзевіча. Пасьля была дэкламацыя і танцы. Публікі як і заўсёгды было шмат. Наагул тутэйшае грамадзянства вельмі цікавіцца беларускімі вечарынамі і прыхільна вітае роднае мастацтва.

Шмат працы па арганізацыі спэктаклю палажыў грам. Казлоўскі.

Тутэйшы.

Як польская адміністрацыя „urzęduje na kresach“.

✦ Вялейскі староста ня даў дазволу гр. Ф. Аляхновічу на беларускі спэктакль у Маладэчыне 7 сьнежня. Мелася быць пастаўлена „Паўлінка“ Купалы.

№ 2 „Нашай Будучыны“ ад 13-га студня быў канфіскаваны па загаду Камісара гор. Вільні.

✦ Кіраўнік пошты Даўгінава ня прыняў падпіску на беларускую газэту ад селяніна вёскі Вардмічы (Вялейшчына), бо селянін не паслухаў яго нагавораў выпісаць польскую газэту.

✦ На пошце Парахвіянава (Дунілоўскі п.) ад гр. Войціка адмовіліся прыняць „polecone“ пісьмо, дзеля таго, што названьне газэты было напісана пабеларуску, хоць увесь адрэс быў напісаны папольску.

▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪

Просім усіх падпішчыкаў „Нашай Будучыны“ аднавіць падпіску і заахвочываць іншых да выпісываньня сваей газэты.

Мы верым, што сьвядомыя беларусы падтрымаюць „Нашу Будучыну“, каб гэтым даць магчымасьць пазнаць несьвядомым сьветлыя ідэалы працоўнага Беларускага Народу.

▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪ ▪

Свая пошта.

Гр. Сьветлавастокаву. Анкеты можа і павінен запоўніць кожны сьвядомы беларус. Адпавецны матэр'ял пры жаданьні можна заўсёды знайсьці. Газэту 30 экз. пасылаем. Стацьцю, аб каторай вы пішаце, рэдакцыя не атрымала.

p. Baltazaru Białopolskiemu z Rusi Czarnej. Вітаем Вас з выздараўленьнем ад летаргіі мазга. Вы праспалі 17 гадоў! За гэты час Вашыя „палякі“ сталі беларусамі і весела сабе жартуюць з Вашага артыкулу „Występy klubu białoruskiego“ у „Dzień. Wilen“. Вясёлыя кавалкі. Пішыце болей што чуваць у вашай чорнай хаўрузіі.

Курс на грошы.

(Віленская біржа.)

Афіцыяльна за 19 студня.

Нямецкія маркі	1,22 і ½
Франкі франц.	1.920
Доляры	30.500

Рэдактар-выдавец А. АМЕЛЬЯНОВІЧ. Друкарня „ДРУК“ Субач, 2.